

**Арцём ЯСЕВІЧ,**
Вучань 9 “А” класа СШ №6
Г. Смаргонь, Гродзенская вобл.

## Адкуль Смаргонь?

**Трапіла мне аднойчы ў рукі прыгожа аформленая кніжка паданняў і легенд “Белая Русь” (выдавецтва “Юнацтва” 2001 г). Багата там цікавых гісторый пра нашы беларускія гарады, вёскі, урочышчы, рэкі і азёры. Але, колькі я не шукаў, а пра маю родную Смаргонь анічога не знайшоў. Напэўна, укладальнікі кнігі не дабраліся да нашага “мядзведжага” кутка. Пішу з іроніяй, таму адразу хачу смайлік паставіць, вось такі напрыклад ☺. Праўда, ён падобны на мордачку мядзведзя? Толькі вушкі дамаляваць. Вы спытаецеся: што гэта я ўсё пра мядзведзя ды пра мядзведзя? А таму, што гэты звер на сучасным гербе**

**нашага горада. І легенда пра самага магутнага звера нашых смаргонскіх лясоў існуе. Мне яе дзядуля расказаў. Нічога, што яна не пра славутую “Мядзведжую акадэмію” князёў Радзівілаў. Яна пра часы больш старажытныя, калі і Радзівілаў яшчэ ў нашых мясцінах не было.**

Спрычыніўся адзін мядзведзь хадзіць на поле, дзе сяляне ячмень вырошчвалі. Ці яму ячмень дасмаку, ці якая іншая прычына, але вытоптваў касалапы палеткі. Бедавалі людзі, што ўраджай прападае. Потым адзін самы кемлівы дзяцюк рыдумаў, як злавіць шкодніка. Устроілі аблаву і злавілі-такі мішку. Пасадзілі на ланцуг. Забіваць яго баяліся, бо па мясцовых прыкметах – мядзведзь істота свяшчэнная, можна было і гнеў багоў наклікаць за такое зло.

Амаль год прасядзеў у палоне звер. Для яго нават вялікі шалаш пабудавалі, дзе мішка зімой адсыпаўся. Хутка вестка пра бурага нявольніка разляцелася па ўсяму акалодку. Пачалі прыходзіць дзівіцца на мядзведзя жыхары іншых мясцовасцей. А найбольш гледачоў сабралася на Купалле. Свята ішло сваёй чарадой: дзяўчаты вянкі плялі ды ў рэчку Оксну кідалі, хлопцы сілай мераліся, моладзі карагоды вадзіла, старыя людзі ў баку сядзелі ды на ўсё гэта дзівіліся. Калі сцямнела, развялі вогнішча, каб сагрэцца і па традыцыі скакаць праз яго. Нагуляўшыся-наскакаўшыся, пайшлі хто па хатах, а хто папараць-кветку шукаць.

Вясна і лета ў той год былі вельмі засушлівымі. І вось іскаркі ад не патушанага вогнішча падхапіў лёгкі ветрык і пачаў з імі забаўляцца. А затым, нагуляўшыся, кінуў у сухую траву. Тая ўмомант успыхнула. Ахапіў агонь усю паляну, на якой Купалле людзі да гэтага святкавалі. Недалёка і мядзведжы шалаш стаяў. Як убачыў буры, што агонь да яго жытла дабраўся, то зароў на ўсю моц! Людзі пачулі яго роў і прыбеглі. Бачаць: аж мішка скача і топча вогненныя языкі, якія паўзуць да яго ад вогнішча. Топча, каб не даць агню дабрацца да яго жытла. Ды так смешна гэта робіць, нібы танчыць.

Затушылі людзі агонь хутка, бо побач жа рэчка была. Праўда мядзведжая поўсць усё ж падсмыліла крыху, і пах ад яе пайшоў няепшы, адным словам – смурод. Яшчэ доўга смярдзела футра мішкі, а за мясцовасцю гэтай замацавалася назва адпаведная. Людзі так і казалі: “Пайду падзівіцца на звера, што жыве там, дзе смурод на гонямі”. З часам словы “смурод” і “гоні” зліліся ў адно – “Смургоні”, затым літара “У” ператварылася ў “А”, бо народ, які тут жыў, больш акаў, чым окаў ці укаў.

А той “танец” мядзведжы ўсе добра запомнілі і зразумелі, якім чынам можна дрэсіраваць звера, каб потым на кірмашах ён людзей забаўляў. Вось, баюць паданні, што і князі Радзівілы спецыяльна загадвалі адлоўліваць

мядзведзяў і “вучыць” іх танчыць на гарачай металічнай падлозе. Але гэта ўжо іншая байка.